Belarus - Абяцаньні Пісаньне - Promises Scriptures

Прыповесьці 13:11 Багацьце, [здабытае] марным чынам, змалее, а хто зьбірае яго рукою сваёю, — памнажае яго.
Прыповесьці 13:22 Добры пакідае спадчыну і ўнукам, а багацьце грэшнікаў захоўваецца для праведных.
Прыповесьці 22:22,23 Не абдзірай убогага, таму што ён убогі, і не ўціскай прыгнечанага каля брамы, 23. бо ГОСПАД будзе бараніць у справе іхняй і адбярэ душу ў тых, што іх абіраюць.
Ісая 59:17; Ісая 61:10 - Эфэсцаў 6:14,17 Дык станьце, падперазаўшы паясьніцу вашую праўдаю, і апрануўшы панцыр праведнасьці, 17. І шалом збаўленьня прыйміце, і меч Духа, які ёсьць слова Божае.
Мацьвея 24:22 І калі б не былі скарочаныя тыя дні, не было б збаўленае ніводнае цела, але дзеля выбраных будуць скарочаныя тыя дні.
Мацьвея 26:41 Чувайце і маліцеся, каб не ўвайсьці ў спакусу. Сапраўды, дух ахвочы, а цела кволае.
Марка 10:48-52 І сварыліся многія на яго, каб замаўчаў, але ён тым мацней закрычаў: Сыне Давідаў, зьлітуйся нада мною! 49. І, спыніўшыся, Ісус сказаў паклікаць яго. І клічуць сьляпога, гаворачы яму: Будзь пэўны, уставай, кліча цябе. 50. Ён, пакінуўшы адзеньне сваё, устаў і прыйшоў да Ісуса. 51. І, адказваючы, гаворыць яму Ісус: Што хочаш, каб Я табе ўчыніў? Сьляпы сказаў Яму: Раббоні, каб мне бачыць. 52. Ісус жа сказаў яму: Ідзі, вера твая збавіла цябе. І адразу ён стаў бачыць, і пайшоў за Ісусам па дарозе. (Мацьвея 20:30-34)
Марка 16:20 А яны, пайшоўшы, абвяшчалі паўсюль Госпада, Які ўспамагаў іх і сьцьвярджаў словы знакамі, якія іх суправаджалі. Амэн.
Лукі 14:23 І сказаў пан слузе: Ідзі на дарогі і да платоў і змушай прыйсьці, каб напоўніўся дом мой,
Лукі 21:15 бо Я дам вам вусны і мудрасьць, якой ня здолеюць пярэчыць, ані супрацьстаяць усе супраціўнікі вашыя.
Лукі 21:36 Дык чувайце, молячыся ва ўсякі час, каб вам быць вартымі ўцячы ад усяго, што мае стацца, і стаць перад Сынам Чалавечым.
Яна 17:15 Не прашу, каб Ты ўзяў іх са сьвету, але каб захаваў іх ад зла.
Дэеі 11:23 Ён, прыйшоўшы і ўбачыўшы ласку Божую, узрадаваўся і маліў усіх, каб пры пастанове сэрца трывалі ў Госпадзе,
Дэеі 13:48 А пагане, чуючы гэта, радаваліся і славілі слова Госпадава, і паверылі ўсе, якія былі прызначаныя да жыцьця вечнага.
1 Карыньцянаў 10:13 Вас наведала спакуса ня іншая, як чалавечая. Але верны Бог, Які не пакіне вас быць спакушанымі больш, чым вы можаце, але са спакусай зробіць і выхад, каб вы маглі перанесьці.
1 Карыньцянаў 16:9 бо для мяне адчыненыя вялікія і зручныя дзьверы і шмат супраціўнікаў.

2 Карыньцянаў 12:9 І [Госпад] сказаў мне: Хопіць табе ласкі Маёй, бо моц Мая спаўняецца ў слабасьці. Дык ахвотна больш буду хваліцца слабасьцямі маімі, каб жыла ў-ва мне моц Хрыстовая.
Эфэсцаў 6:11 Апраніцеся ў-ва ўсю зброю Божую, каб маглі ўстаяць супраць хітрыкаў д'ябла,
Гебраяў 1:7,14 А наконт анёлаў кажа: Ён робіць анёламі Сваімі духаў і служыцелямі Сваімі — полымя агню. 14 Ці ня ўсе яны — паслугавальныя духі, якія пасланыя на служэньне дзеля тых, якія маюць успадкаеміць збаўленьне?
Якуба 4:7 Дык падпарадкуйцеся Богу; супраціўцеся д'яблу, і ўцячэ ад вас.
1 Пятра 5:10 А Бог усякае ласкі, Які паклікаў нас, што крыху цярпелі, у вечную славу Сваю ў Хрысьце Ісусе, няхай Сам удасканаліць вас, няхай умацуе, няхай узмоцніць, няхай угрунтуе.
Прыповесьці 15:13 Радаснае сэрца робіць аблічча вясёлым, а калі сэрца сумуе — дух разьбіты.
Прыповесьці 12:25 Смутак у сэрцы чалавека прыгнятае яго, а добрае слова разьвяселіць яго.
Прыповесьці 13:12 Спадзяваньне, якое доўжыцца, — боль сэрца, а зьдзейсьненае жаданьне — дрэва жыцьця.
Прыповесьці 14:30 Лагоднае сэрца — жыцьцё для цела, а зайздрасьць — парахненьне косткам.
Яна 14:1 Няхай не трывожыцца сэрца вашае. Верце ў Бога і верце ў Мяне.
Яна 14:27 Супакой пакідаю вам, супакой Мой даю вам; ня так, як сьвет дае, Я даю вам. Няхай не трывожыцца сэрца вашае і не палохаецца.
Яна 16:6 Але ад таго, што Я сказаў вам гэта, смутак напоўніў сэрца вашае.
Яна 16:20,22 Сапраўды, сапраўды кажу вам: вы заплачаце і загалосіце, а сьвет узрадуецца; вы сумныя будзеце, але смутак ваш радасьцю станецца. 22. Так і вы цяпер маеце смутак, але Я ўбачу вас ізноў, і ўзрадуецца сэрца вашае, і радасьці вашай ніхто не забярэ ў вас.
Дэеі 2:46 І кожны дзень аднадушна трываючы ў сьвятыні і ламаючы хлеб у дамах, прыймалі ежу ў весялосьці і лагоднасьці сэрца,
Рымлянаў 9:2 што вялікі смутак мой і няспынны боль у сэрцы маім,
2 Карыньцянаў 1:2-4 ласка вам і супакой ад Бога Айца нашага і Госпада Ісуса Хрыста. 3. Дабраслаўлёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста, Айцец міласэрнасьці і Бог усякага пацяшэньня, 4. Які пацяшае нас у кожным прыгнёце нашым, каб мы маглі пацяшаць тых, якія ў-ва ўсялякім прыгнёце, пацяшэньнем, якім Бог пацяшае нас!
2 Карыньцянаў 2:4 Бо з вялікага прыгнёту і ўціску сэрца пісаў я вам з многімі сьлязьмі, не каб вы былі засмучаныя, але каб спазналі любоў, якую я з лішкам маю да вас.
Эфэсцаў 5:19 гаворачы да сябе псальмамі, і гімнамі, і сьпевамі духоўнымі, сьпяваючы і граючы Госпаду ў сэрцах вашых,
Філіпянаў 4:4 Радуйцеся заўсёды ў Госпадзе. Ізноў кажу: радуйцеся.
Якуба 5:13 Мае цяжкасьці нехта з вас? Няхай моліцца. Бадзёры хто? Няхай

псальмы сьпявае.
Пачатку - Ренезіс 20:6 God keep from sinning against Christians.
Зыход 35:21,26 heart make willing духу spirit.
Лічбу 10:35 God arise enemy scatter.
Другазаконне 2:25 fear and dread of God on people.
Егошуа 2:9 terror of God on Jericho.
1 Самуэля 17:48,50 - Давід & Галіяф
Ёва 29:14 robe of righteousness.
Эстэр8:17 fear of Jews on people.
Ісая 35:8 Way of Holiness
Ісая 43:2 fire and water not hurt God's people.
Ісая 49:25 God contend with enemy.
Ісая 54:17 no weapon against God's people.
Ісая 59:19 Духу God lift up standard against enemy floods.
Езэкііл 22:30 God want man pray for people.
Езэкііл 45:8 rulers not oppress God's people.
Данііл 4:16; Данііл 7:4 have heart of man or beast.
Захарыя 4:6 Not by might, nor by power, but by My Духу, saith the LORD of hosts.
Рымлянаў 6:23 Бо плата за грэх — сьмерць, а дар [ласкі] Божай — жыцьцё вечнае ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым.
Рымлянаў 8:2 Бо закон Духа жыцьця ў Хрысьце Ісусе вызваліў мяне ад закону грэху і сьмерці.
2 Цімафея 1:10 а цяпер выяўленае праз зьяўленьне Збаўцы нашага Ісуса Хрыста, Які зьнішчыў сьмерць і зьявіў жыцьцё і незьнішчальнасьць праз Эвангельле,
Езэкііл 37:12,13 God open graves & bring out people - Адкрыцьцё 20:13 І аддала мора мёртвых, што ў ім, і сьмерць ды пекла аддалі мёртвых, што ў іх; і быў суджаны кожны паводле справаў сваіх.
Мацьвея 27:52 І магілы адчыніліся; і шмат целаў памёршых сьвятых папаўставала,
Дэеі 17:25 і не ўтрымліваецца ад рук чалавечых, быццам нечага патрабуючы, Сам даючы ўсім жыцьцё, і дыханьне, і ўсё. (Ёва 12:10)
Адкрыцьцё 13:15 І дадзена яму даць дух вобразу зьвера, каб вобраз зьвера і гаварыў, і рабіў, каб тыя, хто не паклоніцца вобразу зьвера, былі забітыя.
Яна 10:10 Злодзей прыходзіць, каб толькі ўкрасьці, забіць і загубіць. Я прыйшоў, каб вы мелі жыцьцё і мелі ўдосталь.
Адкрыцьцё 22:1 І паказаў ён мне чыстую раку вады жыцьця, сьветлую, як крышталь, якая выходзіла з пасаду Бога і Ягняці.
Яна 4:10 Адказаў Ісус і сказаў ёй: Калі б ты ведала дар Божы і Хто кажа табе: Дай Мне піць, то ты прасіла б у Яго, і Ён даў бы табе вады жывое.
Яна 4:14 Хто ж вып’е ваду, якую Я яму дам, ня будзе смагнуць ніколі, але вада, якую Я дам яму, станецца ў ім крыніцаю вады, якая цячэ ў жыцьцё вечнае.

Прыповесьці 13:14 Закон мудрага — крыніца жыцьця, каб пазьбегнуць пастак сьмерці.
Прыповесьці 14:27 Страх ГОСПАДАЎ — крыніца жыцьця, каб пазьбегнуць пастак сьмерці.
Ярэмію 21:8 - Мацьвея 7:13,14 Уваходзьце праз цесную браму, бо шырокая брама і прасторны шлях, што вядуць да загубы, і шмат хто ўваходзіць праз іх, 14. бо цесная брама і вузкі шлях, што вядуць у жыцьцё, і мала хто знаходзіць іх.
Прыповесьці 10:2 Не прыносяць карысьці скарбы бязбожныя, а праведнасьць ратуе ад сьмерці.
Мацьвея 15:4 Бо Бог загадаў, кажучы: Шануй бацьку твайго і маці, і: Хто праклінае бацьку ці маці, няхай сьмерцю памрэ.
Марка 13:22 Бо паўстануць фальшывыя хрысты і фальшывыя прарокі, і будуць рабіць знакі і цуды, каб зьвесьці, калі магчыма, і выбраных. (Езэкііл 13:17-23)
Яна 5:28,29 Не зьдзіўляйцеся гэтаму: бо прыходзіць гадзіна, калі ўсе, што ў магілах, пачуюць голас Ягоны, 29. і выйдуць тыя, што чынілі добрае, на ўваскрашэньне жыцьця, а тыя, што чынілі благое, — на ўваскрашэньне суду. (Ісая 26:19)
Яна 10:28 І, сказаўшы гэтае, пайшла і паклікала цішком Марыю, сястру сваю, кажучы: Настаўнік прыйшоў і кліча цябе.
Яна 11:43,44 І, сказаўшы гэтае, крыкнуў моцным голасам: Лазар! Выйдзі вонкі! 44. І выйшаў нябожчык са зьвязанымі пахавальнай тканінай нагамі і рукамі, і твар ягоны быў абвязаны хусткаю. Кажа ім Ісус: Разьвяжыце яго і дайце хадзіць.
Яна 12:17 Натоўп жа, які быў з Ім, сьведчыў тады, што Ён выклікаў з магілы Лазара і ўваскрасіў яго з мёртвых.
Яна 17:2 бо Ты даў Яму ўладу над усякім целам, каб усяму, што Ты даў Яму, Ён даў жыцьцё вечнае.
1 Карыньцянаў 15:19-26 Калі мы толькі ў гэтым жыцьці спадзяемся на Хрыста, мы найбольш жалю годныя з усіх людзей. 20. Але цяпер Хрыстос уваскрос з мёртвых, стаўся Першынцам сярод памёршых. 21. Бо як праз чалавека сьмерць, гэтак праз чалавека і ўваскрасеньне мёртвых. 22. Бо як у Адаме ўсе паміраюць, гэтак у Хрысьце ўсе ажывуць, 23. але кожны — у сваім парадку: Першынец — Хрыстос, пасьля — Хрыстовыя ў прыйсьце Ягонае, 24. а пасьля — канец, калі Ён перадасьць Валадарства Богу і Айцу, калі зьнішчыць усякае начальства, і ўсякую ўладу і сілу, 25. бо Яму належыць валадарыць, пакуль пакладзе ўсіх ворагаў пад ногі Свае. 26. Апошні вораг будзе зьнішчаны — сьмерць,
2 Карыньцянаў 1:9,10 Але мы мелі самі ў сабе прысуд сьмяротны, каб спадзявацца не на саміх сябе, але на Бога, Які ўваскрашае мёртвых, 10. Які і выбавіў нас ад так вялікай сьмерці, і выбаўляе, на Якога спадзяемся, што і яшчэ выбаўляць будзе
2 Карыньцянаў 3:6 Які даў нам здольнасьць быць служыцелямі Новага

Запавету, ня літары, але духа, бо літара забівае, а дух ажыўляе.
Каласянаў 1:21,22 І вас, якія былі некалі адлучаныя і ворагі, разуменьнем [зьвернутыя] да злых справаў, 22. цяпер пагадзіў ва ўласным целе Яго праз сьмерць, каб паставіць вас сьвятымі, і беззаганнымі, і бездакорнымі перад Сабою,
2 Цімафея 3:8,9 Як Яннэс і Ямбрэс супрацьстаялі Майсею, гэтак і яны супрацьстаяць праўдзе, людзі з папсаваным розумам, няздатныя ў веры. 9. Але яны ня шмат будуць узрастаць, бо шаленства іхняе выкрыецца перад усімі, як гэта і сталася з тымі. (Езэкііл 13:17-23)
Гебраяў 2:9 а бачым Ісуса, Які крыху быў паніжаны перад анёламі, Які праз пакуту сьмерці атрымаў вянок славы і пашаны, каб з ласкі Божае пакаштаваў сьмерці за ўсіх.
Гебраяў 2:14,15 Дык калі дзеці сталіся супольнікамі цела і крыві, і Ён таксама мае ўдзел у іх, каб праз сьмерць зьнішчыць таго, хто мае ўладу над сьмерцю, гэта ёсьць д'ябала, 15. і вызваліць тых, якія дзеля страху сьмерці праз усё жыцьцё падлягалі няволі.
Гебраяў 11:5 Вераю Энох быў перанесены, што ня ўбачыў сьмерці; і не знайшлі яго, бо перанёс яго Бог. Бо перад перанясеньнем ягоным было засьведчана, што ён спадабаўся Богу.
1 Пятра 3:18 Бо і Хрыстос, каб прывесьці нас да Бога, раз пацярпеў за грахі, Праведны — за няправедных, забіты целам, але ажыўлены Духам,
2 Пятра 1:3 Як Боская моц Ягоная падаравала нам усё дзеля жыцьця і пабожнасьці, праз пазнаньне Таго, Хто паклікаў нас славаю і цнотаю,
2 Пятра 2:1,3 Былі ж і фальшывыя прарокі ў народзе, як і ў вас будуць фальшывыя настаўнікі, якія ўвядуць згубныя герэзіі і адракуцца Ўладара, Які адкупіў іх, сьцягваючы на сябе хуткую загубу. 3. і яны ў хцівасьці будуць падкупляць вас лісьлівымі словамі; суд для гэтакіх здаўна не бязьдзейнічае, і загуба іхняя ня дрэмле.
1 Яна 3:14 Мы ведаем, што перайшлі ад сьмерці ў жыцьцё, бо любім братоў; хто ня любіць брата, застаецца ў сьмерці.
1 Яна 5:11 І гэткае ёсьць сьведчаньне, што Бог даў нам жыцьцё вечнае, і гэтае жыцьцё — у Сыне Ягоным.
Адкрыцьцё 21:6 І сказаў мне: Сталася. Я — Альфа і Амэга, Пачатак і Канец. Таму, хто смагне, Я дам з крыніцы вады жыцьця дарма.
Езэкііл 13:17-23 God delivers the souls of His people from witchcraft.
Ісая 28:15,18 covenant with death, and agreement with hell - God breaks.
Ісая 5:24 rotton root
Ёэля 1:12 withered joy
Осіі 13:15 dry spring & dry fountain.

Pastor T. John Franklin
Church of Salvation, Healing, and Deliverance
COS-HAD.org